*Литература и источники*

1. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. (Очерки истории Северной Белоруссии) / Л.В. Алексеев. — 1966. — Москва: Наука, 1966. — 295 с.
2. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля / Алексеев Л.В. //Древнерусские княжества X–XIII вв. — Москва: Наука, 1975. — С. 202 — 239.
3. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля / Л.В. Алексеев. — Полоцк: Издатель А.И. Судник, 2007. — 52 с. Сер. «Наследие Полоцкой земли». — Вып. 5.
4. Алексеев, Л.В. Смоленская земля в IX — XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии / Л.В. Алексеев. — Москва: Наука, 1980. — 261 с.
5. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории археологии и культуры: в 2 книгах. / Л.В. Алексеев. — Москва: Наука, 2006. — Кн. 1. — 2006. — 289 с.
6. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории археологии и культуры: в 2 книгах. / Л.В. Алексеев. — Москва: Наука, 2006. — Кн. 2. — 2006. — 167 с.
7. Данилевич, В.Е. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия / В.Е. Данилевич. — Киев, 1864. — 264 с.
8. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. —Мінск: БелЭн, 1994. — 510 с.
9. Загорульский, Э.М. Вищинский замок XII — XIII вв. / Э.М. Загорульский. — Мінск: БДУ, 2004. — 159 с.
10. Заяц, Ю.А. Менская зямля: этапы фарміравання / Ю.А. Заяц // Беларускі гістарычны часопіс. — Мінск, 1993. — № 4. — С. 8 — 15.
11. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі: 5-е выд. / У.М. Ігнатоўскі. — Мінск: Беларусь, 1992. — 176 с.
12. Ластоўскі, В. Кароткая гісторыя Беларусі / Вацлаў Ластоўскі: Рэпр. выд. 1910. — Мінск: «Універсітэцкае», 1992. — 126 с.
13. Лысенко, П.Ф. Города Туровской земли. / П.Ф. Лысенко. — Минск: Наука и техника, 1974. — 199 с.
14. Лысенко, П.Ф. Туровская земля. IX–XIII вв. / П.Ф. Лысенко. — Минск: «Наука и техника», 1999. — 268 с.
15. Насонов, А.Н. Русская земля и образование территории Древнерусского государства / А.Н. Насонов. — Москва: Наука, 1951. — 412 с.



16. Пичета, В. Полоцко-Минское княжество и Турово-Пинское княжество / В. Пичета // Очерки истории СССР. — Т. 2. Период феодализма. IX — XIII вв.: в 2-х ч. — Москва: Изд-во АН СССР, 1953. — С. 380 — 393; 414 — 416.
17. Рыбаков, Б.А. Полоцкое княжество / Б.А. Рыбаков // История СССР с древнейших времен до наших дней: в 12 т. Серия первая. Т. 1. — Москва: Наука, 1966. — С. 598 — 601.
18. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. — Минск: Наука и техника, 1978. — 158 с.
19. Шчарбакоў, С.А. Феадальная раздробленасць / С.А. Шчарбакоў // Гісторыя Беларускай ССР: у пяці тамах. — Т. 1. Першабытнаабшчынны лад на тэрыторыі Беларусі. Эпоха феадалізму. — Мінск: Навука і тэхніка, 1972. — С. 109 — 116.

Репозиторий БГПУ

**Ю.У. Врублеўскі (Мінск)**

## ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АНАЛІЗ КАНЦЭПЦЫІ Л.В. АЛЯКСЕЕВА ГЕНЕЗІСА РАННЕСЯРЭДНЯВЕЧНЫХ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ (IX–XIII стст.)

Вынікі сваёй даследчай дзейнасці і асабістую канцэпцыю Л.В. Аляксееў абагульніў у працы «Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн.». Вывучэнне гісторыка-культурнай і гісторыка-археалагічнай спадчыны заходніх зямель Русі IX–XIII стагоддзяў склала аб'ект даследавання Л.В. Аляксеева. Прадметам даследавання Л.В. Аляксеева выступае станаўленне і развіццё гарадоў заходніх зямель Русі дамангольскага перыяду. Даследаванне адлюстроўвае асноўныя дасягненні айчыннай археалагічнай навукі ў вывучэнні гісторыі беларускіх зямель. Акцэнтуючы ўвагу на прывязцы мінулага заходнерускіх зямель да рускай гісторыі, даследчык вылучае існаванне рэгіёна Днепра-Дзвінскага міжрэчча і падкрэслівае асаблівае значэнне транспартных магістраляў. У сістэме поглядаў навукоўца характэрным стала імкненне асэнсаваць фактарнасць геаграфічнай і гісторыка-культурнай узаемаабумоўленасці ў гісторыі беларускіх зямель.

Дэталізацыя і акрэсленне прасторавых межаў зямель Заходняй Русі навукоўцам праводзілася з улікам гістарычных дадзеных, геаграфіі, археалогіі. Звяртаючы ўвагу на асаблівасці навакольнага асяроддзя беларускіх зямель, даследчык не менш важнае значэнне надаваў і распрацоўцы праблем складвання гарадскіх цэнтраў на тэрыторыі Беларусі. Разуменне адрознай спецыфікі станаўлення беларускіх гарадоў, вылучэнне асобнага навуковага перыяду існавання гарадскіх папярэднікаў, шырокі дыяпазон даследавання прасторавых межаў гарадоў адрозніваюць канцэптуальны погляд Л.В. Аляксеева ад падыходаў айчынных гісторыкаў. У абагульненым выглядзе даследчык канцэнтраваў увагу на праблемах археалагічнага вывучэння гісторыі ўсіх раннесярэдневяковых гарадоў на беларускіх землях IX – XIII стагоддзяў. Гэта, безумоўна, сведчыць аб поўнай шырыні межаў абранага прадмета аўтарскага даследавання. Асабістае значэнне Л.В. Аляксееў надаваў даследаванню паходжання і развіцця Друцка і Мсціслаўля на падставе дадзеных, якія былі ім атрыманы падчас раскопак.

Даследуючы гісторыю паходжання гарадоў на тэрыторыі Беларусі, Л.В. Аляксееў вылучае перыяд IX – пачатку XI стагоддзя, які быў ім названы як «гнёздаўскі этап». Увядзенне навуковай перыядызацыі станаўлення гарадоў на землях Беларусі робіць даследаванне аўтара каштоўным, аднак пры гэтым неабходна зрабіць і некаторыя агаворкі. Галоўным крытэрыем навукоўца ў выдзяленні асобнага перыяду стала ўстанаўленне падабенства развіцця археалагічнага комплексу Гнёздава пад Смаленскам з Полацкам, Віцебскам, Мінскам, Барысавам, Друцкам і іншымі гарадамі. Перыяд «гнёздаўская эпоха», вызначэнне якога грунтуецца на эталонных паказчыках археалагічнага помніка і характары яго развіцця, не можа ў поўнай меры адлюстроўваць працэс узнікнення ўсіх цэнтраў на тэрыторыі Беларусі. Таму перыяд «гнёздаўскай эпохі» ў большай ступені характарызуе заканамернасці пераходнай стадыі грамадства і не зусім паслядоўна ўпісваецца ў стадыю развіцця прагарадскіх цэнтраў дадзенай эпохі для ўсёй Беларусі.

З гнёздаўскім часам Л.В. Аляксееў звязваў функцыянаванне так званых «гарадкоў» на тэрыторыі Беларусі. Па меркаванні даследчыка, «гарадкі» як аснова будучых гарадоў (прагарады) ўзнікалі ў месцах рачных адгалінаванняў і гандлёвых шляхоў і атрымоўвалі



сваю назву па рэкам. Гарадкі Л.В. Аляксеева абавязаны сваім паходжаннем гандлю, багаццю рачных камунікацый. Раскрываючы сацыяльную сутнасць «гарадкоў», даследчык звярнуў асабістую ўвагу на заканамернасці іх узнікнення і далейшую трансфармацыю. У светаўспрыманні Л.В. Аляксеева адчувальным уяўляецца ўплыў гандлёва-рамеснага шляху паходжання гарадоў. Разглядаючы «гарадкі» як гандлёва-рамесныя цэнтры, якія з'явіліся ў гнёздаўскі час, Л.В. Аляксееў услед за В. В. Сядовым зазначаў, што там «произошла кристаллизация военно-дружинного, торгового и ремесленеческого люда» [2, с. 74]. У адпаведнасці з логікай разважання навукоўца, цэнтры, якія ўзнікалі на гандлёвых рачных шляхах, складалі аснову для гандлёва-рамесных пасяленняў (гарадкоў). У спіс дадзеных цэнтраў аўтар аднёс гарадкі на Палаце, Віцьбе, Лукомке, Менке, Друці, Свіслачы, Барысе. Можна пагадзіцца з тым, што больш торнымі заставаліся Полацк, Віцебск, Лукомль і ў сваёй аснове мелі гандлёва-рамесны шлях паходжання.

У межах першай стадыі градаўтварэння, якая была датавана Л.В. Аляксеевым IX–X стагоддзямі, у рэгіёне Днепра-Дзвінскага міжрэчча ўзнікалі гандлёва-рамесныя пасяленні. Праблема нераўнамернасці часавага ўзнікнення гарадоў на астатніх беларускіх землях у наступныя дзесяцігоддзі, вылучэнне і абгрунтаванне часавых межаў другой стадыі градаўтварэння засталіся не да канца вырашанымі. Аб'ектыўнае стаўленне навукоўца да тлумачэння прычын нераўнамернага ўзнікнення гарадоў на тэрыторыі Беларусі на падставе навакольна-геаграфічнага фактару можна прызнаць аб'ектыўным. Аднак у працэсе непаслядоўнага з'яўлення гарадоў неабходна ўлічваць і асаблівасці тэрытарыяльна-дзяржаўнага будаўніцтва на беларускіх землях.

Праблема стварэння навуковай перыядызацыі, якая была пастаўлена ў працы Л.В. Аляксеева, засталася вырашана напалову. Па сваёй сутнаснай прыкмеце стадыя «гарадкоў» IX–X стагоддзяў, якая паказана аўтарам першым этапам градаўтварэння, не мае дачынення да ўсіх рэгіёнаў беларускіх зямель. Другая стадыя так і не была вызначана навукоўцам, што патрабуе ад сучасных даследчыкаў складання не проста лінейнай перыядызацыі, а вызначэння храналагічных рамак з улікам прасторавых межаў і рознасці часавых адхіленняў. Л.В. Аляксееў адным з першых у разуменні генезіса гарадоў на Беларусі наглядна паказаў іх нелінейны транс-

Рэпазіторый БДПУ

фармацыйны працэс[a]. Разам з тым, вылучэнне гнёздаўскага этапа гарадоў Днепра-Дзвінскага міжрэчча як адрознага перыяду, уласцівага канкрэтнаму рэгіёну, патрабуе фарміравання цэльнай карціны непаслядоўнага станаўлення гарадоў і па астатнім рэгіёнам з характэрнымі заканамернасцямі трансфармацыйных працэсаў.

Вызначаючы генезісныя формы раннесярэдневяковых гарадоў на тэрыторыі Беларусі, даследчык імкнуўся абаснаваць мяжу пераходнай стадыі іх далейшай трансфармацыі. Сцвярджэнне Л.В. Аляксеева аб тым, што «городки исчезают одновременно с концом эпохи Гнёздова — в начале — первой половине XI в.» [2, с. 74] у сваёй аснове не супярэчыць агульнагістарычным тэндэнцыям развіцця ўтвараемага грамадства. У цэлым, можна пагадзіцца з думкай аб тым, што «гарадкі» ўжо не задавальнялі новыя ўмовы і адбываўся іх «перанос» на новае і больш зручнае месца [2, с. 74]. Яшчэ ўкраінскі даследчык П.П. Талочка падкрэсліваў факт кароткачасовага існавання гандлёва-рамесных пасяленняў [4, с. 164].

Разам з тым, неабходна больш дэталёва асэнсаваць сутнасць пераходных працэсаў як градаўтварэння, так і грамадскага ладу. Змяненне першапачатковага месцазнаходжання «гарадкоў» гэта не толькі вынік усталявання новых адносін, але і адна з умоў складвання новай сістэмы грамадства, якая заснавана на тэрытарыяльнай дыферэнцыяцыі новаўтвараемых цэнтраў.

Падкрэсліваючы значэнне рамесна-гандлёвага шляху паходжання гарадоў, даследчык не выключаў і іншыя мыгчымасці фарміравання гарадскіх цэнтраў. Л.В. Аляксееў схільны быў лічыць, што на аснове племянных цэнтраў узніклі Полацк, Лукомль, Мінск, Тураў, Слуцк, Друцк, Гомель. Было б вартым паказаць, у якой пераемнасці знаходзіліся паміж сабой гандлёва-рамесны і племянны цэнтр Полацка, Віцебска, Лукомля, Мінска, Друцка і іншых гарадоў. У тэарэтычным разуменні праблемы шляхоў і ўмоў паходжання гарадоў неабходна прызнаць правільнасць суджэння Л.В. Аляксеева, згодна з якім эканамічныя прычыны ўзнікнення гарадоў былі адзіныя, а шляхі іх складавання — розныя. Узаемаабумоўленасць

[a] *Канец X — XI стагоддзе: час станаўлення Полацка, Мінска, Віцебска, Лукомля, Друцка, Заслаўя, Турава, Клецка, Рагачова. XI стагоддзе: час станаўлення Лагойска, Копысі, Оршы, Гродна, Навагрудка, Слоніма, Бярэсця, Ваўкавыска, Турыйска, Пінска, Клецка, Чартарыйска, Гомеля, Рэчыцы. XII стагоддзе: час станаўлення Барысава, Давыд-Гарадка, Мазыра, Мсціслаўля.*



гандлёва-рамеснага і племяннога шляхоў узнікнення гарадоў даследчык паказаў наступным чынам: «Для его конкретного возникновения... необходимы два обстоятельства: торгово-транзитный путь <...> и наличие укрепленного пункта, гарантирующего его безопасность. Последним мог быть и замок феодала, и монастырь, и даже племенной центр» [1, с. 132]. Не адасабляючы «замкавую тэорыю» і «тэорыю племянных цэнтраў», даследчык аб'ектыўна прадвызначыў шматварыянтныя асновы складвання гарадоў.

Аналіз поглядаў Л.В. Аляксеева паказаў, што ён надаваў увагу не толькі канструяванню асабістых падыходаў і поглядаў, а і ацэнкам іншых навукоўцаў. У сваёй дзейнасці даследчык аб'ектыўна і ўзважана асэнсаваў творчы патэнцыял папярэдніх гісторыкаў і сучаснікаў. Заслугай Л.В. Аляксеева з'яўляецца значны ўклад у развіццё беларускай археалогіі гарадоў сярэдневякоўя. Асабліва паказальнымі ў дадзеным выпадку выступаюць яго даследаванні, якія былі прысвечаны суцэльнаму вывучэнню гісторыі і археалогіі беларускіх зямель.

Зазначаючы ўклад Л.В. Аляксеева ў даследаванне праблем паходжання гарадоў на тэрыторыі Беларусі, неабходна звярнуць увагу і на некаторыя недахопы, якія ў цэлым не зніжаюць агульную ацэнку канцэпцыі. Закранаючы праблему паходжання назвы гарадоў, Л.В. Аляксееў непераканаўча аргументаваў паходжанне назвы Барысава. Так, даследчык зазначаў, што назва горада паходзіць ад рэчкі Брыса [2, с. 73]. Аднак, у адпаведнасці з канцэпцыяй В.В. Сядова, гарады, якія заканчваюцца на суфіксы «-ов», «-ев» («-аў», «-еў»), указваюць на асабістасць паходжання. Таму назва горада Барысава ўтворана ад імя князя Барыса і суфікса прыналежнасці «—аў» [3; 5]. Пры рэканструкцыі старажытнай тапаграфіі Віцебска, Л.В. Аляксееў памылкова вызначыў на карце месцазнаходжанне гарадзішча. Яно паказана аўтарам у тым месцы, дзе знаходзіцца роў [2, с.123].

Праблема фактарнай узаемаабумоўленасці станаўлення носьбітаў гарадскіх арганізмаў, якая ўскрыта ў канцэпцыі Л.В. Аляксеева, дазваляе сцвярджаць, што навуковец не выступаў с абсалютызацыяй адзінай (сацыяльна-эканамічнай) варыятыўнай асновы ўзнікнення горада, а падкрэсліваў яе значэнне ў развіцці генезісных форм гарадоў. На падобных метадалагічных пазіцыях знаходзяцца Э. М. Загарульскі і Г.В. Штыхаў, якія дакладна паказалі ўзаемаўплыў сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-палітычных фактараў градаўтварэння.

Репозиторий БГПУ

*Літаратура і крыніцы*
1. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля. Очерки истории Северной Белоруссии в IX — XIII вв. / Л.В. Алексеев. — Москва: Наука. — 1966. — 295 с.
2. Алексеев, Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн: кн. 1. / Л.В. Алексеев. — Москва: Наука, 2006. — 289 с.
3. Седов, В.В. Древнерусская топонимия на белорусской территории / В. В. Седов // Пытанні беларускай тапаніміі. — Мінск, 1970. — С. 17 — 25.
4. Толочко, П.П. О торгово-ремесленном пути становления древнерусских городов / П.П. Толочко // История и культура древнерусского города. — Москва, 1989. — С. 159 — 167.
5. Штыхаў, Г.В. Барысаў у складзе Полацкай зямлі / Г.В. Штыхаў // Дзевяць стагоддзяў Барысава. — Мінск: БЕЛТА, 2002. — С. 5 — 14.

**А.А. Трусаў (Мінск)**

# РОЛЯ Л.В. АЛЯКСЕЕВА Ў РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАГА КРАЯЗНАЎСТВА

Леанід Васільевіч Аляксееў шмат гадоў працаваў на Беларусі. Тут ён скончыў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР у 1950 годзе, а перад гэтым з 1948 па 1950 год працаваў у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі. У 1962—1966 гадах чытаў агульны курс археалогіі ў Магілёўскім педагагічным інстытуце.

Тэмай яго кандыдацкай дысертацыі былі помнікі археалогіі Полацкай зямлі. Шмат гадоў ён праводзіў археалагічныя раскопкі ў Мсціславе. Таксама вывучаў археалагічныя помнікі Браслава і Друцка.

Акрамя непасрэдных археалагічных даследаванняў Л. Аляксееў вывучаў гісторыю археалогіі Беларусі і мясцовае краязнаўства. Гэтай справе ён прысвяціў сваю манаграфію пад рэдакцыяй акадэміка Барыса Рыбакова (які таксама пачаў сваю навуковую кар'еру на Беларусі), якая мае назву «Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е годы XX в.» [1].



Гэта кніга прысвечана памяці знакамітага беларускага гісторыка Міколы Улашчыка і выйшла ў свет пры дапамозе Віцебскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея. У прадмове да кнігі Аляксееў выказвае асаблівую падзяку дырэктару музея Кузьменку і мясцоваму краязнаўцу дацэнту Рыўкіну.

Леанід Аляксееў лічыць, што гістарызм як з'ява свядомасці людзей узнік на Беларусі адначасова з летапісаннем у XI — XII стагоддзях. Ён вылучае чатыры этапы краязнаўства на Беларусі: «народны», «магнацкі», «дылетанцкі» і «навуковы».

«Народны» этап самы старажытны, калі самі людзі звяртаюць увагу на помнікі гісторыі. Ранні перыяд гэтага этапа скончыўся ў XVI стагоддзі. Да гэтага часу людзі яшчэ памяталі пра сутнасць і прызначэнне канкрэтных помнікаў археалогіі, такіх як гарадзішчы і курганы. Пазней з'яўляюцца розныя прыгожыя паданні пра пахаванні волатаў, пра «шведскія» ці «французскія» магілы.

Даследчык вылучае народныя паданні пра старажытныя дарогі, дарогі часоў Вітаўта, Альгерда і Баторыя. Людзі цікавіліся помнікамі сваёй гісторыі, не разбуралі іх (асабліва курганы) і ставіліся да іх з павагай.

«Магнацкі» перыяд — гэта позняе сярэдневякоўе (XV—XVIII стагоддзі), калі беларускія магнаты Радзівілы, Сапегі, Валовічы, Храбтовічы і іншыя збіралі ў сваіх палацах і замках унікальныя калекцыі розных артэфактаў.

«Дылетанцкі» перыяд Аляксееў пачынае з XVI стагоддзя, і першым яго прадстаўніком лічыць М. Стрыйкоўскага, які ўпершыню вывучаў помнікі гісторыі і археалогіі на месцы і нават шукаў канкрэтныя месцы даўніх бітваў. Таксама ён вылучае дзейнасць гродзенскага архімандрыта І. Кульчынскага (30-я гады XVIII стагоддзя), які ўпершыню звярнуў увагу на падабенства муроўкі Полацкай Сафіі і Каложскай царквы.

Новую хвалю цікавасці да помнікаў старажытнасці выклікала вайна 1812 года. Гэта дзейнасць Нарбута, гуртка Румянцава ў Гомелі, даследаванні Какрына і Кэппена.

Пачатак «навуковага» перыяду ў краязнаўстве Беларусі прыпадае на 30—40-я гады XIX стагоддзя. Заснавальнікамі беларускай археалагічнай навукі былі браты Тышкевічы, якія стварылі ў сваім маёнтку ў Лагойску першы беларускі археалагічны музей. Вялікае значэнне ў развіцці краязнаўства адыгралі мясцовыя губернскія ведамасці, якія ў беларускіх губернях пачалі выходзіць з 1838 года.

Репозиторий БГПУ